# СКАЛЬДЫ Ў СКАНДЫНАЎСКАЙ ТРАДЫЦЫІ: ПАХОДЖАННЕ І МЕСЦА Ў ГРАМАДСТВЕ

А.Д. Паўлавец

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Скальды займалі месца ў карціне свету паўночнаэўрапейца ў сярэднявеччы, а іх творчасць ўпляталася ў звычаёвае жыццё, як ўпляталася ў яго жыццё

ўжыванне мядовых напояў, ды імя скальда неадрыўна звязвалася з паняткам піру. Вось чаму так важна знайсці крыніцу і прычыну ўзьнікнення скальдаў. Для лепшага арыентавання ў матэрыяле нам неабходна высунуць гіпотэзу, якая будзе гучаць прыкладна так: сацыяльная роля скальда выдзялілася ў выніку раздзялення вайсковае і абрадавае роляў кануга.

Першым, хто навучыў складаць вершы людзей быў Одзін, які з'яўляўся не толькі культурным героем, але яшчэ і богам–канунгам. У заключнай частцы эдычнай "Песьні пра Рыга" можна назіраць нараджэнне яскравых адрозненняў паміж людзьмі, якія былі вольныя ад умоўнасцяў грамадства і людзей, што карыстаюцца грамадствам для праявы сябе. Нараджэнне такіх двух розных па сваім змесце сацыяльных роляў суправаджаліся складанымі і глыбокімі зменамі. Сістэма каштоўнасцяў, што ўсталёўвалася даволі доўга, сістэма абавязкаў і прававыя палі, што склаліся пад час родавага грамадства, пачынаюць ламацца. З IX стагоддзя пачынаецца нарматыўны канфлікт, звязаны з складваннем новай сістэмай абавязкаў і выдзяленнем новых сацыяльных роляў. Канунгі Вестфольда пачынаюць барацьбу за аб'яднанне Нарвегіі. Ва ўмовах усталявання новага, феадальнага ладу ішла дэфферэнцыяцыя на культурную і палітычную сферы, а з імі і на ролі, прычым апошняя ў тых умовах практычна атаясамлівалася з ваеннай функцыяй. У канунгаў ўзнікла патрэба ў людзях, якія б выконвалі абрадавыя функцыі. Так з'яўляюцца людзі новай сацыяльнае ролі-скальды.Незалежнасць, неардынарнасць думання скальда, была звязаная з яго верай і верай іншых у яго heil (поспех). Heill скальда звязваецца на прамую з розумам, звязваецца з мёдам паэзіі, heill скальда гэта іх талент.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У выніку феадалізацыі грамадства адбываецца дыферэнцыяцыя грамадскіх функцыяў. Скальд як новая сацыяльная катэгорыя ўступае ў нарматыўны канфлікт у выніку якога фармуецца ўяўлене пра heill скальда. Якое патрэбны для таго, каб абараніць сваё прававое поле ад нападак з боку грамадства і канунгаў.